# Указ

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

30 снежня 2022 г. № 453 г.Мінск

Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

1. За выдатныя дасягненні ў галіне музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музейнай справы, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысудзіць спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2022 года:

аўтарскаму калектыву ў складзе Барысевіч Яніны Анатольеўны, загадчыка аддзела традыцыйнай мастацкай культуры дзяржаўнай установы культуры ”Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці“, Мазепа Наталіі Аляксандраўны, намесніка дырэктара дзяржаўнай установы ”Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры“, Егіазаряна Георгія Анушаванавіча, старшыні Кансультатыўнага міжэтнічнага савета пры Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей, старшыні грамадскага аб’яднання ”Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства ”Айастан“, – за ўклад ва ўмацаванне нацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве, правядзенне Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур;

грамадскаму аб’яднанню ”Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя“ – за ўклад у грамадзянска-патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, рэалізацыю сацыяльна значных дзіцячых праектаў і ініцыятыў;

дзяржаўнай установе ”Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ”Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь“ – за значныя дасягненні ў галіне музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны;

калектыву дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы ”Гомельскі палацава-паркавы ансамбль“ – за вялікі ўклад у развіццё музейнай справы, рэалізацыю выставачных праектаў па захаванні гістарычнай памяці беларускага народа;

калектыву дзяржаўнай установы культуры ”Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей“ – за вялікі ўклад у развіццё народнай мастацкай творчасці, адраджэнне традыцый шапавальства;

калектыву дзяржаўнай установы культуры ”Цэнтр народнай творчасці і рамёстваў у г.п.Копысь Аршанскага раёна“ – за актыўную дзейнасць па захаванні тэхналогій стварэння вырабаў традыцыйнай керамікі Аршанскага раёна;

калектыву ўстановы адукацыі ”Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства“ Міністэрства адукацыі – за выдатныя дасягненні ў выхаванні моладзі, рэалізацыю культурна-турыстычных праектаў;

народнаму фальклорнаму калектыву ”Таняжанка“ філіяла ”Тонежскі сельскі дом культуры“ дзяржаўнай установы ”Лельчыцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці“ – за значныя дасягненні ў захаванні музычнай спадчыны, звычаяў і традыцый Палескага рэгіёна;

творчай майстэрні эстраднага мастацтва ”Хвілінка“ грамадскага аб’яднання ”Беларускі саюз музычных дзеячаў“ – за высокае прафесійнае майстэрства, актыўны ўдзел у грамадска-культурных праектах патрыятычнай тэматыкі;

установе Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ”Выдавецкі дом ”Беларусь сегодня“, дзяржаўнай установе ”Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь“ – за значную работу па фарміраванні грамадскай свядомасці, папулярызацыю гісторыі партызанскага і падпольнага руху Беларусі.

2. Міністэрству культуры ажыццявіць выплату спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2022 года са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

3. Вызваліць сумы прэмій, атрыманых у адпаведнасці з дадзеным Указам, ад абкладання падаходным падаткам з фізічных асоб.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь — А.Лукашэнка

АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Для правовых актов
* 2 *

10